**З А Ц В Я Р Д Ж А Ю**
Дырэктар ДУК “Ляхавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

_____________ В.А.Пляшэвіч

**ПАЛАЖЭННЕ**
**аб правядзенні раённага творчага конкурса бібліятэкараў на стварэнне і афармленне краязнаўчых куткоў “Бібліятэка – цэнтр краязнаўства”**

**1. Агульныя палажэнні**

1.1. Палажэнне аб правядзенні раённага творчага конкурса бібліятэкараў на стварэнне і афармленне краязнаўчых куткоў “Бібліятэка – цэнтр краязнаўства” (далей – Конкурс) вызначае парадак арганізацыі і правядзення конкурсу, умовы ўдзелу і катэгорыі ўдзельнікаў, крытэрыі ацэнкі работ, парадак падвядзення вынікаў Конкурсу і ўзнагароджання пераможцаў.

1.2. Заснавальнікам Конкурсу з’яўляецца ДУК “Ляхавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”.

1.3. Арганізатар Конкурсу – аддзел бібліятэчнага маркетынгу Ляхавіцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя. Я. Купалы.

**2. Мэты і задачы Конкурсу**

Стварэнне ўмоў для далучэння чытачоў да вывучэння гісторыі роднага краю праз папулярызацыю краязнаўчых рэсурсаў бібліятэкі, заахвочванне бібліятэкараў – удзельнікаў конкурсу да краязнаўчага пошуку, чытання краязнаўчай літаратуры, выяўленне творчых здольнасцяў бібліятэкараў пры афармленні краяхнаўчых куткоў, выкарыстанне новых форм работы.

**3. Умовы правядзення Конкурсу**

3.1. У Конкурсе прымаюць удзел бібліятэкары ДУК “Ляхавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”.

3.2. Тэрмін правядзення конкурсу – ***люты 2021***.

3.3. Конкурс праводзіцца на ўзроўні ДУК “Ляхавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма” у адпаведнасці з дадзенным палажэннем.

**4. Крытэрыі ацэнкі конкурсных работ:**

– рацыянальнасць размяшчэння краязнаўчага кутка;
– адпаведнасць афармлення і напаўнення тэматыцы;

– змест матэрыялу – колькасны і якасны (наяўнасць буклетаў, альбомаў, паштовак, малюнкаў, фотаздымкаў, вырабаў, карцін, насценгазет, карт, артыкулаў з газет, мастацкай літаратуры, падборак вершаў і іншае.);

– культура афармлення (акуратнасць, эстэтычнасць, кампазіцыя, каляровае рашэнне і т. д.);

– адзнака майстэрства бібліятэкараў пры прэзентацыі кутка (валоданне матэрыялам, уменне звязаць аповяд з паказам зместу кутка, культура мовы і эмацыйнасць пры паднясенні, камунікатыўная культура, па жаданні – удзел чытачоў).

**5. Падвядзенне вынікаў і ўзнагароджанне пераможцаў**

5.1. Для падвядзення вынікаў Конкурсу вызначана камісія ў складзе:

Пляшэвіч В.А, дырэктара ДУК “Ляхавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”,

Мацулевіч Л.П., загадчыка аддзела бібліятэчнага маркетынгу,

Новік А.А., бібліятэкара аддзела бібліятэчнага маркетынгу,

Зелянко Т.У., загадчыка сектара бібліятэчна-інфармацыйных і электронных паслуг.

5.2. Вынікі Конкурсу падводзяцца да 31 сакавіка 2021 г. і афармляюцца пратаколам.

5.3. Вызначаюцца пераможцы, якія занялі I, II і III месцы.

5.4. Узнагароджванне пераможцаў Конкурсу адбудзецца не пазней за 12 красавіка 2021 г.

Мацулевіч 6 07 87